НАБЫТКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ ШКОЛЫ ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ БССР ПРАФЕСАРА ФЁДАРА МІХАЙЛАВІЧА ЯНКОЎСКАГА

Мароз Валянціна Канстанцінаўна
прафесар кафедры беларускай і замежных моў "Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь"; доктар філалагічных навук, прафесар
(г. Мінск, Беларусь)

Рэспубліканскія канферэнцыі да юбілейных датаў знакамітых беларускіх навукоўцаў праводзяцца ў шмат якіх вышэйшых навучальных установах Беларусі. На кафедрах беларускага мовазнаўства Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна – гэта навуковыя зборы, прысвечаныя прафесару Ф.М. Янкоўскаму, прафесару Г.М. Малажай, прафесару У.А. Калесніку. Сённяшняя канферэнцыя «Актуальныя праблемы лінгвістыкі, лінгвастылістыкі і лінгвакультуралогіі» ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова заклікана засяродзіць навуковую грамадскасць Рэспублікі на сутнасных арыенцірах навуковай дзейнасці доктара філалагічных навук, прафесара, прафесара кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства М.В. Абабуркі, з нагоды чыйго 75-годдзя мы ўсе тут сабраліся.

Як адзначана ў юбілейным артыкуле «Беларускае слова стала сэнсам яго жыцця» («Роднае слова», № 3, 2016), вызначальным паваротам у жыццёвым лёсе Мікалая Васілевіча стала вучоба і творчае супрацоўніцтва з навуковым кіраўніком па кандыдацкай дысертацыі доктарам філалагічных навук прафесарам М.А. Жыдовіч, выкладчыкамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Львом Шакуном, Еўдакіяй Мяцельскай, Яўгенам Камароўскім, Віктарам Краснеем, Алегам Лойкам, Нілам Гілевічам.

Не будзе памылкі, калі сказаць, што этапным для М.В. Абабуркі было знаёмства і з доктарам філалагічных навук прафесарам Фёдарам Міхайлавічам Янкоўскім, загадчыкам кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута, цяпер Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка. І хоць Мікалаю Васілевічу не давялося прайсці пры гэтай кафедры аспірантуру – атрымаць *філалагічную вывучку* (як любіў гаварыць сам Ф.М. Янкоўскі, які прыйшоў на кафедру ў 1953 г., ад 1956 да 1982 г. быў за-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гадчыкам кафедры, а з 1983 да 1989 гг. заставаўся на ёй прафесарам-кансультантам), пазней лёс распарадзіўся так, што этапы станаўлення навуковай дзейнасці М.В. Абабуркі непасрэдна звязаны з навуковай лінгвістычнай школай прафесара Ф.М. Янкоўскага.

Каб шырэй далучыць да навукова-метадычнай працы лінгвістаў-беларусаведаў, Ф.М. Янкоўскі ўзначаліў і шмат гадоў паспяхова кіраваў Рэспубліканскім метадычным аб'яднаннем. Помніцца, на адным з такіх паседжанняў, відаць, пад уражаннем той творчай атмасферы, якая панавала ў аўдыторыі, М.В. Абабурка не ўстрымаўся: "Вось бы і ў нас правесці такі навуковы збор!", на што быў лаканічны адказ прафесара: "Рабіце!". Сцвярджаць, што менавіта гэтая фраза стала вызначальнай у навуковай скіраванасці Мікалая Васільевіча нельга, але несумненна адно: усе, хто патрапляў у кола навуковых клопатаў Фёдара Міхайлавіча, мелі магчымасць далучыцца да сістэмнай працы, мелі вынікі і здабывалі прафесійны аўтарытэт. Па выніках паседжанняў семінара, якія заўсёды праходзілі плённа, матэрыялы друкаваліся ў навуковым зборніку "Лінгвістычны аналіз тэксту". Тут у 1975-м годзе М.В. Абабурка змясціў два свае артыкулы ("Адносна лінгвістычнага аналізу тэксту", "Элементы вусна-гутарковай мовы ў рамане І. Мележа "Людзі на балоце"), а праз пяць гадоў быў падрыхтаваны і выдадзены дапаможнік для студэнтаў "Пытанні і заданні па "Лінгвістычным аналізе тэксту" (1980). Такім чынам, можна канстатаваць, што вытокі самых маладых напрамкаў у сучаснай беларускай філалогіі – лінгвастылістыкі і лінгвакультуралогіі, якія так вынікова распрацоўвае М.В. Абабурка, вядуць у 70-я гады XX ст., калі клопатам кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута была распачата навуковая тэматыка па лінгвістычным аналізе тэксту, а ў вучэбныя планы ВНУ быў уведзены спецыяльны курс "Лінгвістычны аналіз тэксту".

Ф.М. Янкоўскі быў уважлівы да ўсяго новага, што выдавалася па беларусістыцы, не абыходзіў увагаю створанае маладымі даследчыкамі. Так, у яго знайшоўся час праз часопіс "Полымя" адгукнуцца аўтарытэтнай рэцэнзіяй на слоўнік-даведнік "Дыялектызмы ў творах беларускіх пісьменнікаў", укладзены М.В. Абабуркам (Мінск, 1979). Вучоны выказаў сцверджанне, што жывыя гаворкі былі і застаюцца галоўнай крыніцай узбагачэння беларускай літаратурнай мовы і "ставіць жалезабетонныя слупы" паміж дзвюма формамі нацыянальнай мовы не выпадае.

З вялікай адказнасцю ставіўся Ф.М. Янкоўскі да падрыхтоўкі маладых вучоных, добразычліва дапамагаў іх творчаму росту, перадаваў свой багаты вопыт і веды. Кожны, хто меў шчасце вучыцца ў яго, можа засведчыць – Фёдар Міхайлавіч умеў разгледзець навуковыя схільнасці асобы, падказаць перспектыўную тэму, цярпліва весці да абароны, а затым трымаць у полі зроку, рупячыся пра адпаведнае месца для сваіх выхванцаў у прафесіі і навуцы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пад яго кіраўніцтвам паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі вядомыя на сёння спецыялісты-мовазнаўцы ў вядучых галінах адукацыі і філалагічнай навукі Рэспублікі Беларусь – А. Каўрус, Я. Адамовіч, Л. Падгайскі, Г. Малажай, К. Панюціч, М. Гуліцкі, В. Рабкевіч, І. Лепешаў, А. Каляда, В. Шур, Н. Бурака, Т. Трыпуціна, Л. Жураўская, Т. Тамашэвіч, М. Аляхновіч, В. Несцяровіч, М. Даніловіч, В. Мароз, Л. Васюковіч, Г. Паддубская, С. Рачэўскі, Н. Нямковіч, М. Новік. Шырыня тэматыкі аспірантаў Ф.М. Янкоўскага – ад тапанімікі і антрапанімікі беларускай мовы да перыфразы ў літаратурнай форме мовы; ад гісторыі беларускай лексікаграфіі да беларускай фразеалогіі ў гісторыі летапісання, а таксама літаратурнай творчасці ад XVI ст. да XX ст.; ад фразеалогіі твораў Кандрата Крапівы да аналізу мовы Цёткі (Алаізы Пашкевіч), Ядзвігіна Ш., Якуба Коласа, Янкі Брыля; ад дзеяслоўна-іменных словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове да сінтаксісу беларускіх народных прыказак і казак і інш.

Гэты пералік толькі часткова адлюстроўвае шырыню навуковай зацікаўленасці самога прафесара Ф.М. Янкоўскага, хто стварыў узоры інтэлектуальнай і мастацкай творчасці на беларускай мове, каго вяло глыбокае перакананне, што «наш час вымагае не бясследнага існавання, а жыцця, запоўненага клопатам і працаю, жыцця для Радзімы-Бацькаўшчыны».

Прафесар, доктар філалагічных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі Ф.М. Янкоўскі – адзін з вядомых у Рэспубліцы вучоных-лінгвістаў. Ён працаваў пераважна ў такіх цікавых і складаных, але мала распрацаваных галінах беларускага мовазнаўства, як фразеалогія, стылістыка, дыялектная лексікаграфія, арфаэпія. У творчай спадчыне прафесара да 300 прац: манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, падручнікі, артыкулы па беларускім і агульным мовазнаўстве, па культуры мовы.

Адсочваючы дынаміку моўных працэсаў XX ст., скіраваную на звужэнне арэалу дыялектных зон не толькі беларускай мовы, але і наогул еўрапейскіх моў, Ф.М. Янкоўскі шмат увагі аддаваў вывучэнню дыялектаў. У кандыдацкай дысертацыі "Глускія гаворкі" (1954) дэталёва апісаў фанетычную і марфалагічную сістэму глускіх гаворак, растлумачыў узнікненне асобных дыялектных рысаў, вызначыў ступень іх устойлівасці, паказаў, як народныя гаворкі ўзаемадзейнічаюць з літаратурнай мовай. Вынікі даследавання засведчаны ў трох выпусках «Дыялектнага слоўніка», дзе адлюстравана не толькі дыялектная лексіка Глушчыны, а і пададзены паралелі з іншых беларускіх гаворак, некаторых славянскіх і неславянскіх моваў – польскай, чэшскай, балгарскай, нямецкай.

Упершыню ў гісторыі беларускага мовазнаўства Фёдар Міхайлавіч склаў багатую картатэку фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, устойлівых параўнанняў, афарызмаў і іншых выслоўяў. Яго працы ў галіне народнай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фразеалогіі адкрылі новыя раздзелы беларускай лінгвістыкі – фразеалогію і фразеаграфію. У кнізе "Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі" вучоны тэматычна спарадкаваў і лексікаграфічна апісаў больш за 50 тысяч устойлівых народных выказванняў (у тым ліку і фразеалагізмаў), даў кароткі каментарый. У другім выданні кнігі «Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» (1962) павялічыў колькасць фразеалагізмаў, пашырыў каментарыі. Трэцяе выданне кнігі, значна дапоўненае, выйшла ўжо без Фёдара Міхайлавіча ў 1992 годзе.

Выдадзеная ў 1968 годзе «Беларуская фразеалогія: фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне» з'явілася першым тлумачальным слоўнікам беларускай народнай фразеалогіі, які адразу прыцягнуў увагу даследчыкаў мовы, пісьменнікаў. Ф.М. Янкоўскі падаў у слоўніку самае выразнае, тыповае і разам з тым далікатнае, мілагучнае. Невыпадкова гэта кніга мае не толькі вялікую навуковую каштоўнасць, а і шырокае практычнае прымяненне: ёю карыстаюцца выкладчыкі і студэнты вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры; яна стала настольнай кнігай пісьменнікаў, журналістаў, філолагаў. Нямецкі вучоны-славіст Карл Гутшміт адзначаў, што гэтая праца адзіная ў сваім родзе ў славістыцы.

У 1969 годзе прафесар Ф.М. Янкоўскі блискуча абараніў доктарскую дысертацыю «Беларуская народная фразеалогія», у якой прааналізаваў больш за 7500 уласна фразеалагізмаў. Вучоны прытрымліваўся разумення фразеалогіі ў шырокім і вузкім значэнні. Ён даследаваў мнагазначныя народныя фразеалагізмы, паказаў адметнасць фразеалагічнай сінанімікі народнай мовы. Характарызуючы сінанамічныя адносіны ў фразеалогіі, ён адрозніваў агульнанацыянальную сінаніміку ад сінанімікі асобных гаворак, разглядаў праблему фразеалагічнай варыянтнасці, якую пазней даследаваў у кнігах «Роднае слова» (1972), «Беларуская мова» (1978), «Беларуская фразеалогія» (1981), «Сучасная беларуская мова» (1984). На багатым фактычным матэрыяле народнай фразеалогіі даследчык прааналізаваў фанетычную, лексічную, марфалагічную, сінтаксічную, камбінаваную варыянтнасць фразем, паказаў іх спалучальныя магчымасці, асаблівасці ўжывання, этымалогію многіх фразем, даў структурна-граматычную характарыстыку тыповых мадэляў беларускіх фразеалагізмаў.

Увага Ф.М Янкоўскага да народнай фразеалогіі была яго вялікім грамадзянскім клопатам пра ўзбагачэнне літаратурнай мовы. Яго працы вызначаюцца глыбінёй даследавання, актуальнасцю, багаццем і надзейнасцю ілюстрацыйнага матэрыялу, арыгінальнасцю падыходаў. Яны атрымалі высокую ацэнку вучоных-філолагаў свету, пісьменнікаў. Народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль пісаў, што ў бібліятэцы кожнага, хто разумее значэнне народнага слова, яго "гаючы ўплыў на наша мастацкае ды й маральнае здароўе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наогул”, стаяць кнігі гэтага беларускага вучонага, што “такі набытак не сорам ад імя Беларусі пакласці на міжнародны стол”.

Таксама Ф.М. Янкоўскі вывучаў афарыстычныя выслоўі літаратурнай мовы, якія змясціў у кнізе «Крылатыя словы і афарызмы: З беларускіх літаратурных крыніц» (1960). Гэта была першая ў беларускім мовазнаўстве спроба навуковага асэнсавання ролі крылатых выслоўяў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Аўтар падаў разнастайныя паводле структуры крылатыя выслоўі і сінтаксічна закончаныя вобразныя выразы: *Мой родны кут, Як ты мне мілы! /Я. Колас/; Воля сонейку раўня / Я. Купала /; Дум не скуеш ланцугамі /Я. Купала/; Будзем сеяць, беларусы /П. Броўка/*; устойлівыя словазлучэнні: *атаман мужыцкай праўды, людзьмі звацца /Я. Купала/*; і асобныя словы: *Туляга.* Праблема афарыстычнасці слова не пакідала даследчыка. Ён планаваў стварыць вялікі слоўнік беларускіх афарызмаў, выбраных з літаратурных твораў розных пісьменнікаў. Шэраг артыкулаў вучонага прысвечаны афарызмам Янкі Купалы, Якуба Коласа, Янкі Брыля, Ларысы Геніюш, Антона Лявіцкага. Ядзвігіна Ш. Задума вучонага рэалізавана яго паслядоўнікамі – Н.В. Гаўрош і Н.М. Нямковіч у кнізе “Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў” (Мінск, 2011).

Значнае месца сярод даследаванняў Ф.М. Янкоўскага займаюць працы «Пытанні культуры мовы», «Беларускае літаратурнае вымаўленне», «Вусная мова і выразнае чытанне» і інш. Усе яны прасякнуты клопатам пра выпрацоўку ў вучняў, студэнтаў, работнікаў друку, радыё навыкаў правільнага разумення слова, яго ўжывання, літаратурнага вымаўлення. Вучоны добра разумеў неабходнасць ведаў па гісторыі мовы для глыбокага пазнання працэсаў і з’яў сучаснай беларускай мовы. Вынікам яго шматгадовай працы ў інстытуце, роздуму над методыкай выкладання курса гістарычнай граматыкі з’явіўся дапаможнік для студэнтаў «Гістарычная граматыка беларускай мовы» (тры выданні), напісаны з улікам апошніх дасягненняў мовазнаўства. Аўтар па-новаму падае шмат якія пытанні фанетыкі і марфалогіі, шырока выкарыстоўвае параўнанні з іншымі славянскімі мовамі, паказвае сувязь гісторыі мовы з гісторыяй народа. Вялікая вартасць падручніка – яго даступнасць для студэнтаў і адначасова глыбокая навуковасць.

Абагульненым вынікам шматгадовай працы Ф. Янкоўскага з’явілася манаграфія «Беларуская мова» (1978). У кнізе знайшлі адлюстраванне пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе выкладання, у практыцы карыстання мовай. Фёдар Янкоўскі паказвае асаблівасці беларускай і рускай фанетыкі, марфалогіі, сінтаксічных сістэм, падрабязна характарызуе вымаўленне галосных і зычных у беларускай мове. У сучасным беларускім грамадстве ва ўмовах афіцыйнага білінгвізму паралельна ўжываецца і вывучаецца беларуская і руская мова, і супастаўленне іх асаблівасцей дапамагае лепш засвоіць правілы вымаўлення слоў і іх форм, асэнсавана запомніць граматычныя нормы абедзвюх моў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Навуковыя школы – гэта ўвасабленне новых навуковых ідэй, канцэптуальнае развіццё і паглыбленне навуковых напрамкаў даследавання таго, што заснавалі пачынальнікі. Вучыцца працаваць Ф.М. Янкоўскі меў шчасце ў сваіх вялікіх папярэднікаў: навуковым кіраўніком аспіранта Ф. Янкоўскага быў акадэмік В.І. Баркоўскі, вучань і выхаванец заснавальніка беларускай філалогіі Я.Ф. Карскага. Школа самога прафесара Ф.М. Янкоўскага вызначалася ідэйна-тэматычнай шматвектарнасцю, што дазваляла кожнаму праявіць сябе ў час напісання кандыдацкай дысертацыі, а пасля працаваць сумесна ў межах навуковых выданняў і праектаў. Паказальнымі выступаюць навуковыя дачыненні прафесара Ф.М. Янкоўскага і прафесара Г.М. Малажай, якая атрымала ад яго актуальную, на той час не распрацаваную не толькі ў беларускай лінгвістыцы, але і ўвогуле ў славістыцы, тэму па перыфразе. Своечасова падрыхтавала дысертацыйнае даследаванне (што, зрэшты, было нормай для аспірантаў Ф.М. Янкоўскага) і, у адрозненне ад іншых, адразу па абароне пры навуковым рэдагаванні Ф.М. Янкоўскага выдала кнігу “Беларуская перыфраза : (кароткі слоўнік)” (1974). Навуковым рэдактарам выступаў, як і ў шматлікіх выданнях іншых сваіх вучняў, Ф.М. Янкоўскі.

Сярод спадкаемцаў школы прафесара Ф.М. Янкоўскага менавіта Г.М. Малажай вызначалася паслядоўнасцю ў перайманні не толькі ідэй, але і формаў працы свайго Настаўніка. Узначаліла кафедру беларускай мовы Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута і давяла да статусу кафедры беларускага мовазнаўства, на якой навуковая праца ў галіне беларускага набыла сістэмны характар. Праз кафедру вялася актыўная падрыхтоўка навуковых і прафесійных кадраў. І тут Галіна Мікалаеўна праявіла зайздросны талент – не проста весці за сабой студэнта, аспіранта, выкладчыка-пачаткоўца, а выхоўваць навукоўца, ставіць на крыло, далучаючы да сумеснай вучэбна-метадычнай і выдавецкай дзейнасці. Пры Г.М. Малажай, разам з ёй у калектыўным клопаце, рыхтавалі навуковыя і вучэбна-метадычныя публікацыі, атрымліваючы прафесійную вывучку, усе.

Г.М. Малажай, як і Ф.М. Янкоўскі, не чакала іншых, магчыма, больш спрыяльных часоў, нічога не адкладвала на потым. Неабходна адзначыць яе нястомную рупнасць па перавыданні сваіх кніг з адпаведнай дапрацоўкай, пашырэннем зместу, абнаўленнем лінгвістычнага матэрыялу. Варта зрабіць поўны пералік зробленага ёю, каб пераканацца, наколькі плённым можа быць развіццё навуковых ідэй на перспектыву: 1) Беларуская перыфраза : (кароткі слоўнік) (1974); Перыфраза: вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ін-таў (1980); Сучасная беларуская мова : Перыфраза [вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ін-таў] (1980); Сучасная беларуская мова : Слова. Перыфраза. Фразеалагізм : вучэб. дапам. для пед. ін-таў (1992); 2) Лінгвістычны аналіз тэксту : Заданні. Тэксты. Парады : вучэбны дапам. для пед. ін-таў (1982); Лінгвістычны аналіз

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тэксту : вучэбны дапам. для філ. фак. пед. ін-таў (1992); 3) Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове : вуч. дапам. для студэнтаў філ. фак.пед. ін-таў Беларусі (1986); Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ (1999).

Усведамленне высокага служэння Бацькаўшчыне, узбагачэнне і ўзвелічэнне духоўных набыткаў свайго народа стала жыццёвым крэдам Ф.М. Янкоўскага і ягоных вучняў і паслядоўнікаў. Узбагачэнне і ўзвелічэнне духоўных набыткаў свайго народа было яго жыццёвым прынцыпам, а творчыя і навуковыя набыткі яскрава дэманструюць невычэрпны патэнцыял беларускай нацыі і далучаюць яго імя да кагорты тых постацяў XX стагоддзя, што пакінулі след у навуцы, сталі заснавальнікамі новых напрамкаў у галіне беларускай лінгвістыкі і літаратурнай творчасці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова